Камсамольскі



Сьпеўнік

Бібліатэка „Чырвоная Зьмена"

1924

Менск

КАМСАМОЛЬСКІ СЬПЕЎНІК

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ ГАЗЭТЫ „МАЛАДЫ АРАТЫ“.

Набрана і надрукована
ў 2 дзярж. друкарні Белтрэст-
друк. Менск. у ліку 4000

Глаўліт. № 2830. Зак. № 3791.

⁂

Камсамол узяў на сябе справу даць вёсцы камсамольскую песьню, акамсамоліць старыя матывы. Бо ніхто, апроч камсамолу пакуль што гэтага не зрабіў.

Няхай жа ня скардзяцца на нас тыя, чые сьпевы мы ужо крыху „па камсамольску“ апрацавалі.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ СЬПЕВЫ

Інтэрнацыянал.

Паўстань пракляцьцем катаваны,
Паўстань хто з голаду век пух.
Бурліць наш розум збунтаваны
Няволі кліча рваць ланцуг.
Стары парадак мы зруйнуем
Магутным выбухам сваім.
І сьвет на новы лад збудуем
Хто быў нічым, той будзе ўсім.
Гэта бой наш астатні
За працоўны народ.
Каб злучнасьцю братняй
Узняўся людзкі род.
Ніхто ня дасьць самохаць волі—
Ні бог, ні цар, ні багатыр
Даб'ёмся самі лепшай долі...
Дабро для ўсіх—наш правадыр!
Каб ня згібаці плеч пакорных,
Каб волі дух лунаў у нас,—
Адважна плаўма сталь у горнах,
Пакуль у кузьні жар ня згас!..
Гэта бой наш астатні
За працоўны народ.
Каб злучнасьцю братняй
Узняўся людзкі род...

Мы ўсе работнікі, сяляне —
Сусьветны рой працаўнікоў —
Меццъ будзем ня зямлі ўладаньне
А дармаеды — прэч! далоў!
    Жывіцца целам нашым годзе,
    Усім трутнём і груганом!
    Для нас паўстаўшых сонца ўсходзе
    Сьвяціць нам будзе век вяком!
Гэта бой наш астатні
За працоўны народ.
Каб злучнасьцю братняй
Узьняўся людзкі род!

Адвеку мы спалі.

Адвеку мы спалі і нас разбудзілі
Мы знаем што трэба рабіць.
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку
Што трэба зладзеяў пабіць.
    Што гэта за марная доля няшчасная
    Бяз хлеба, бяз грошай працуй.
    Усюды ганяюць, усюды сьмяюцца
    Ну проста, хоць крыкні ратуй!
Сьмяюцца над намі багатыя людзі
Здаецца панамі іх зваць.
Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня будзем
Дык пойдзем мы долю шукаць.
    Мы дружна устанем з касамі, сярпамі
    Прагонім з зямлі палачэй.
    Няхай нас сустрэнуць палямі, лугамі
    Грамады працоўных людзей!..

Кавалі.

Мы—кавалі з юнацкім духам,
Куём мы будучыны дні--
Наш цяжкі молат ўзьлятае пухам
І ў сталь магутную зьвініць.
Мы—кавалі зямлі рабочай—
Аб лепшым толькі лятуцім.
Але нядарам мы трацім сілы,
Нядарам стальлю мы грымім.
Бо сталь сваім магутным гулам
Рве путы цемры векавой,
І ў гарадох зямное кулі
Рабочы люд ўстае сьцяной.
Куём мы шчасьце для народу
Правы на ўласнае дабро,
І за жаданую свабоду
Мы ўсе змагаліся й памром.
Мы—кавалі з юнацкім духам...
Куём мы будучыны дні—
Наш цяжкі молат ўзьлятае пухам
І ў сталь магутную зьвініць.

КАМСАМОЛЬСКІЯ СЬПЕВЫ.

Мы — кавалі з юнацкай дружбы,
Куем мы будучыны дні.
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
Куем мы [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
Мы — кавалі з юнацкай дружбы,
Куем мы будучыны дні.
[illegible]
[illegible]

Маладняк

(Маладая гвардыя).

Сьмялей! Зару спаткаем,
Сябры у барацьбе!
Карцечай і штыкамі
Праб'ём мы шлях сабе.
Шчыльней рады! На новы шлях!
Вышэй юнацкі вольны сьцяг
Мы—маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

* * *

Мы паднявольнай працы
Спазналі ўсе прыгон
І радасьці ў юнацтве
Ня ведалі мы дзён:
Ў пакуце вечнай несьлі мы
На душах цемры кайданы,
Мы—маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

* *
*

Пад гоман звонкай сталі
Лілі мы пот і кроў
І шчасьце мы кавалі
Для банды гандляроў.
Але прыгон, што нас душыў,
Барацьбітамі нас зрабіў—
Мы—маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

* *
*

На бой з гвалтаўнікамі
Сябры, за намі ўсьлед!
Мазольнымі рукамі
Мы створым новы сьвет.
За намі ўсе! Гартуйце сталь!
Сьмялей, у сонечную даль.
Ў бой, маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

Наша карманьёла.

Сем год жылі мы барацьбой (2 разы)
Гудзеў гром бітвы над зямлёй (2 разы)
Гневам сьвет запаліў наш магутны парыў (2 р.)
Паскачам карманьёлу! Ліся гром барацьбы (2 р)
Гэй жывей, жывей, жывей (2 р)
На ліхтары буржуяў ўзьдзёрнем
Сьмялей паўстанцы бунтары — стрымалі-б
толькі ліхтары (2 р.)
Паскачам карманьёлу! Ліся гром барацьбы (2 р.)
Цяпер-жа ў мірнай працы час (2 р.)
Ракою пот зьлівае нас (2 р.)
Мы цяпер адпачнём, карманьёлу сьпяём (2 р.)
(П р ы п е ў).

Пра што плаце нам Мілюкоў (2 р.)
«Зьніштожу я бальшавікоў (2 р.)
Шкода толькі, што я стаў кадэт бяз „Руля“!
Ну, к чорту ўсіх кадэтаў—ліся гром барацьбы (2 р.)
(П р ы п е ў).

Пра што крычыць Пуанкарэ (2 р.)
„Калі даўгі дасьцё вы мне? (2 р.)
Праглынуць нос гатоў, ды баіцца штыкоў
Ну, к чорту ўсіх буржуяў! Ліся гром барацьбы (2 р.)
(П р ы п е ў).

Што там плявудзгае эсэр (2 р.)
„Ня прызнаю СССР (2 р.)
„Пачакаю яшчэ год—мяне клікне сам народ
— Чакай, скулу дастанеш! Ліся гром барацьбы (2 р.).
(П р ы п е ў).

Пра што тлумачыць зьмена вех (2 р.)
„І рэвалюцыя—ня грэх! (2 р.)
„Недабром, ці дабром—учрадзілку мы зьбяром
— Зьбярыце, папрабуйце! Ліся гром барацьбы (2 р.)
(П р ы п е ў).

Мітрапаліт цяпер гнусіць (2 р.)
„Няхай вас бог благаславіць (2 р.)
„Я таксама за народ, абы мне быў даход!
— Жыўцом яго на неба, ліся гром барацьбы (2 р.)
(П р ы п е ў).

Ашто пляце нам меншавік: (2 р.)
„Як дыктатуры ня прывык (2 р.)
„Нельга так прыгнятаць—не даюць мне брахаць.
— Ну к чорту ўсіх эсдэкаў! Ліся гром барацьбы (2 р.)
(П р ы п е ў).

Пра што нам кажа камуніст: (2 р.)
„Шлях рэвалюцыі цярніст—(2 р.)
„Не прасіць, не чакаць, не настайваць, а ўзяць!
Вось гэта нам да смаку! Ліся гром барацьбы (2 р.)
Гэй жывей, жывей, жывей на ліхтары
буржуяў ўзьдзёрнем (2 р.)
Сьмялей, паўстанцы бунтары! стрымалі-б
толькі ліхтары.
Паскачам карманьёлу! Ліся гром барацьбы (2 р.)

Майская.

Па вуліцы савецкай,
Вясёлай, маладзецкай,
Рабочы май
Таварыш, спатыкай.
Мы сіняблузай сілай
Па майскіх небасхілах
Ідзём, расьцём
І радасна пяём.
Вясёлай песьняй-сонцам
Мы ворага прыкончым
Бязладзьдзе мы даб'ём
Магутным кулаком.
Пашлём мы селяніну
І кнігу і машыну—
Машына, кніга, хлеб
Памогуць кончыць нэп....
Мы знаем—будуць буры
Ў Парыжы, ў Рыме, ў Руры
Ад гэтых самых бур
З фашыстаў сойдзе дур.
Вясёлы май, ты з намі
Ўздымай жа сьцяг наш слаўны
Няхай жыве зямля
Рабочых і сялян.

Чырвоная армія...

Белая армія, чорны барон
Зноў нам рыхтуюць царскі трон...
Ды ад тайгі да брытанскіх марэй
Армія чырвоная ўсіх мацней.
Дык хай чырвоная
Свой штык гартованы
Трымае моцнаю рукой.
І ўсе павінны
Мы бязупынна
Ісьці ў апошні страшны бой.
Станем мы моцнай сталёвой сьцяной—
Рэвваенсавет нас кліча ў бой.
Бо ад тайгі да брытанскіх марэй
Армія чырвоная ўсіх мацней.
Дык хай чырвоная
Свой штык гартованы
Трымае моцною рукой
І ўсе павінны
Мы бязупынна
Ісьці ў апошні страшны бой.

Мы распалім пажар на ўвесь сьвет,
Цэркваў і турмаў зьніштожым і сьлед,
Бо ад тайгі да брытанскіх марэй
Армія чырвоная ўсіх мацней
Дык хай чырвоная
Свой штык гартованы
Трымае моцнаю рукой
І ўсе павінны
Мы бязупынна
Ісьці ў апошні страшны бой.

———

ВАЙСКОВА-МАЛАДНЯЦКІЯ

Мы распалім пажар на ўвесь сьвет,
Цэркваў і турмаў зьнішчожым і сьлед.
Бо ад тайгі да брытанскіх мораў
Армія чырвоная усіх мацней
Дык хай чырвоная
Свой штык [illegible]
Трымае мазольнаю рукой
І усе павінны
Мы бесупынна
Ісьці ў апошні смяротны бой

Мы пайшлі ўжо ваяваці...

Будзь здаровы, бацька,—маці,—
Мы пайшлі ўжо ваяваці.
Сьвішча куля: й'яй-ха-ха!
Каля вуха дзяцюка.

Што за доля, што за воля—
Камсамольцу выйсьці ў поле.
Сьвішча куля. ... і г. д.

Нам няўцям віхры, грымоты:
Дадае нам гром ахвоты:
Сьвішча куля. ... і г. д.

Днём ваюем, ночкай дрэмем,
А што блізка вораг—кемім.
Сьвішча куля.. .. і г. д.

Сьпім на ўзьмежку пад ігрушай,
Дожджык моча, сонца суша.
Сьвішча куля...., і г. д.

Ёсьць, ці не хлеб і да хлеба:
І бяз хлеба знойдзем неба.
Сьвішча куля..... і г. д.

Мы—ваякі, забіякі;
Сьцеражэцеся, ламакі.
Сьвішча куля..... і г. д.

Камандзір наш знае дзела,—
Ён на ворага йдзе сьмела.
Сьвішча куля.. .. і г. д.

Паваюем, пагаруем,
Зато ўсюды запануем.
Сьвішча куля..... і г. д.

Запануем, як і людзі,
Ў хату вораг лезьць ня будзе.
Сьвішча куля..... і г. д.

Янка Купала.

Я—хлапец малады...

Я—хлапец малады,
Я—дзяцюк хоць куды,
І бяз меры я дуж,
Звацъ мяне Беларус.
Эх, як стане у рад
Малайцоў гэткіх шмат,
Усе вольны яны—
Беларусі сыны.
Дык як стануць—пайдуць,
Гдзе стогн, крыўда жывуць,
Кажы сьмела тады:
Больш ня будзе бяды.
Гэй, юнацкая моц.
І у дзень і у ноч
На старожы ты будзь.
Каб ісьці, дзе стогн чуць.
Хай з юнацкіх грудзей
Па зямельцы усей
Скрозь імчыць, як страла,
Беларусі хвала...

Габруська.

Габруся ў салдаты ўзялі,
Ад дамоўства адарвалі:
Зажурыўся стары татка,
Цяжка стогне, плача матка:
— Ой, Габруська, ой, Габруська.
Ня журбуйце, тата, маці:
Я ўсядзець ня мог у хаце,
Сам пайшоў па добрай волі
Паспытаць ваеннай долі,
Ня журбуйце, ня журбуйце.
Сваякі ўсе і суседзі—
Ніхто дома з іх ня ўседзіў,
Выйшлі ўсе з аднэю радай—
Бараніцца ад нападу,
Бараніцца, бараніцца.
Мучыць вораг наш заўзяты:
Паламаў нам нашы хаты,
Патаптаў нам наша поле,
Пакараў людцоў няволяй.
Мучыць вораг, мучыць вораг.
І мы ў шапку спаць ня будзем,
І пакажам сьвету, людзям,
Як баронім межы родны
Ад напасьці, ад нягоднай,
Як баронім, як баронім.

Янка Купала.

Гэй паехаў сын Даніла...*)

Гэй, паехаў сын Даніла
Ваяваць на вайну,
Ад нападу, ад няволі
Бараніць старану.
Сына маці выпраўляла,
Паясочак дала
Каб заўсёды матку помніў,
Як паедзе з сяла...
А дзяўчына, міла сэрцу
Правяла за сяло
І дала на памяць персьцень,
Каб у бітвах вязло.
Так паехаў сын Даніла
Сам сабой на вайну,
Азірнуўся на хаціну
Ды змахнуў сьлязіну.
Ехаў поле і другое,
Трэцьце поле дасьціг,
Дзе сабраліся салдаты
З сёл і вёсак усіх.
І пайшлі яны паходам
Дружна сьмела пайшлі,

*) Чытаць пасьля 27 стар.—29, а потым 28 стар.

Важна ехалі да дому,
Як тых пчолаў буйны рой.
А наперадзе ўсіх едзе
Наш Даніла з вайны,
Шабля бліскае пры боку,
Конь пад ім буланы.
Ён вязе ўсім падарункі:
Маці срэбны кутас,
А сваей дзяўчыне мілай
Доўгі пацерак зьвяз.

Я. Купала.

Каб вон злыбяду прагнаці
З Беларускай зямлі
Добра ўсе там ваявалі;
Умíралі у баю,
А найлепш Даніла біўся
За айчызну сваю.
Хто йшоў ззаду, а хто збоку—
Азіраўся назал,
А Даніла ўсюды ўперад
Выступаці быў рад.
І ручыла, шанцавала
Ў бітвах цяжкіх яму.
Ажно вораг напужаны
Дзіваваўся таму.
Год мінуў, як ваяваці
Шоў Даніла з сяла,
А ўжо слава па ўсім сьвеце
Аб ім громка ішла.
Як ачысцілі ваякі
Край ад ворага свой,

Гэй, у лесе, пры даліне.

Гэй, у лесе, пры даліне
У нас сталася бяда.
    Гэй, гэй, ў лесе, ў лесе
    У нас сталася бяда.

К нам там выйшла на сустрэчу
Дзяўчынанька малада.
    Гэй, гэй, выйшла, выйшла
    Дзяўчынанька малада.

А мы, хлопцы, ўсе нязломкі.
Спадабалі ўсе яе.
    Гэй, гэй, хлопцы, хлопцы
    Спадабалі ўсе яе.

Кожны лезе па юнацку
Прытуліці да сябе.
    Гэй, гэй, лезе, лезе
    Прытуліці да сябе.

Чуць ня сталі нашы хлопцы.
За дзяўчыну біцца там.
        Гэй, гэй, сталі, сталі
        За дзяўчыну біцца там.

Аж тут кажа камандзір наш
Кінуць жэраб'я ўсім нам.
        Гэй, гэй, кажа, кажа
        Кінуць жэраб'я ўсім нам.

Хто лёс будзе мець шчасьлівы,
Будзе мець дзяўчыну той.
        Гэй, гэй, будзе, будзе,
        Будзе мець дзяўчыну той.

А так біцца за спадніцу
Не гадзіцца, дружа мой,
Гэй, гэй, біцца, біцца
Не гадзіцца, дружа мой.

Вось мы лёсы пацягнулі,—
Ах, каб цёмны на іх вір.
Гэй, гэй, лёсы, лёсы, —
Ах, каб цёмны на іх вір.

Самі, братцы, пасудзеце:
Выйграў дзела камандзір.
Гэй, гэй, братцы,
Выйграў дзела камандзір.

Я. Купала.